гледжання, з прычыны менавіта ідэйнай скіраванасці твораў, аўтарскага погляду на сучаснасць праз прызму мінуўшчыны.

Літаратура

1. Бурдзялёва, І. Сентыменталізм у творчасці Уладзіслава Сыракомлі. / Ірына Бурдзялёва / Уладзіслаў Сыракомля: Матэрыялы міжнароднай навуковай канферэнцыі, прысвечанай 180-годдзю з дня нараджэння польскага і беларускага паэта і этнографа. Мінск-Любань 29 – 30 верасня 2003 года, Мінск "Беларускі кнігазбор", 2004. С. 39
2. Кісялёў, Г. Выбранае / Генадзь Кісялёў. – Мінск: Беларуская навука, 2016. – 571 с. С. 506 – 508.
3. Мархель, У. І. Творчасць Уладзіслава Сыракомлі / У. І. Мархель, – 2-е выд., дапоўненае і перапрацаванае. – Мінск: Беларуская навука , 2005. – 236 с. С. 71.
4. Мархель, У. І. Уладзіслаў Сыракомля. У.І. Мархель / Гісторыя беларускай літаратуры XI – XIX стагоддзяў. У 2 т. Т 2. Новая літаратура: другая палова XVIII – XIX стагоддзе / Нац. акад. навук Беларусі, Інт. мовы і літ. Імя Я. Коласа і Я. Купалы; навук. рэд. тома У.І. Мархель, В. А. Чамярыцкі. – 2-е выд. – Мінск: Беларус. Навука, 2010. – 582 с. С. 251 – 274.
5. Рагойша, В. П. Літаратуразнаўчы слоўнік: тэрміны і паняцці: для школьнікаў і абітурыентаў / В. П. Рагойша. – Мінск: Народная асвета, 2009. – 303 с. С. 74.
6. Gawęda – geneza, definicja, cechy. Gatunki literackie. Uniwersytet Warszawski. Największa w Polsce baza notatek Notatek.pl [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: https://notatek.pl/gaweda-geneza-definicja-cechy. Дата доступу: 10.01.2017.
7. Cywiński S. Syrokomla, człowiek i twórczość. Wilno, 1923. S. 49.
8. Romankówna M., Władysław Syrokomla. Życie i twórczość. Kraków, 1975. 33 s.
9. Słownik pisarzy. Streszczenia lektur opracowane przez profesjonalistów Bryk.pl –[Электронны рэсурс]. Рэжым доступу: https://www.bryk.pl/słowniki/słownik_pisarzy/85312-syrokomla_władysław_1823_1862.html. Дата дотупу: 10.01.2017.
10. Stępnik, K. Drobne formy narracyjne w literaturze krajowej / Krzysztof Stępnik, – Annales Universitatis Mariae Curie-Skłodowska. Sectio F, Humaniora 31, – Lublin: Instytut Filologii Polskiej Wydziału Humanistycznego UMCS, 1976. – s. 257 – 270. // Czasopisma humanistyczne. [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: http://bazhum.muzhp.pl/media//files/Annales_Universitatis_Mariae_Curie_Sklodowska_Sectio_F_Humaniora/Annales_Universitatis_Mariae_Curie_Sklodowska_Sectio_F_Humaniora-r1976-t31/Annales_Universitatis_Mariae_Curie_Sklodowska_Sectio_F_Humaniora-r1976-t31-s257-270/Annales_Universitatis_Mariae_Curie_Sklodowska_Sectio_F_Humaniora-r1976-t31-s257-270.pdf. Дата доступу: 10.01.2017.
11. Syrokomla, W. Wybor poezji / Wladyslaw Syrokomla. 2-e wyd., zmienione. Wroclaw: Ossolineum, 1970. – 426 s.

Maryna Varabei

The center for Belarusian culture, language and literature research, The Yanka Kupala Institute of Literature, History of Belarusian Literature sector

3-Zna@mail.ru

Genre and theme features of historical conversations by Wladyslaw Syrokomla

Keywords: historical conversation, the Belarusian literature, history of Belarusian literature, genre, lyric-epic.

The article pays attention to the unexplored W. Syrokomla's historical conversations. Discrepancies in the definition of genre affiliation of historical works (in particular, poems and conversations) are traced due to researched historiography. Thematic features of W. Syrokomla's historical conversations are defined based on the content of the works.

Г.А.Гладкова

Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П.М.Машэрава

e-mail: anngrin@mail.ru

УДК 821.162.1-311.6.09

АСЭНСАВАННЕ ЛЁСУ ПАЎСТАННЯ 1830–1831 гг. У РАМАНЕ Т.Я ПАПІ "ЦЯРНІСТЫМ ШЛЯХАМ"

Ключавыя словы: эміграцыйны рух, паўстанне 1830-1831 гг., Рэч Паспалітая, Расійская імперыя, канфедэрацыя.

У артыкуле разглядаецца лёс паўстанцаў 1830-1831 гг, адлюстраваны ў рамане польскай пісьменніцы XIX стагоддзя Тэрэсы Ядвігі Папі. Падкрэслена асаблівая роля эміграцыйнага руху ў Францыі, дзе апынулася частка ўдзельнікаў узброенага выступлення, таксама звернута ўвага на становішча палякаў, высланых углыб Расійскай імперыі.

Ядвіга Тэрэса Папі (Jadwiga Teresa Papi), польская пісьменніца, перакладчыца і педагог, з'яўляецца аўтаркай шэрагу гістарычных твораў, адрасаваных маладому пакаленню палякаў, сярод якіх вылучаецца раман "Po ciernistej drodze" ("Цярністым шляхам") (Кракаў, 1896), падпісаны псеўданімам J.T.Gałęzowska. Шырокая эпічная панарама твора адлюстравала значны перыяд гісторыі, які ахапіў першую трэць XIX стагоддзя, з асаблівай увагай да падзей 1830-х гг.

Літаратуразнавец Г.Маркевіч адзначаў, што польская гістарычная проза канца XIX стагоддзя па зразумелых прычынах надавала мала ўвагі тэме народных паўстанняў, падкрэсліваючы, што амаль адзінымі прыкладамі такой літаратуры для моладзі былі творы В.Пшыбароўскага і Т.Я.Папі [4, с.345].

Репозиторий ВГУ

Як вядома, паўстанне 1830-1831 гг. (у польскай гісторыяграфіі – Лістападаўскае (польск. Powstanie listopadowe)) было чарговай спробай патрыятычных сіл краіны вярнуць незалежнасць, страчаную ў выніку трох падзелаў Рэчы Паспалітай напрыканцы XVIII стагоддзя і аднавіць канфедэрацыю ў межах 1772 года. Значная ўвага ў творы нададзена прычынам паражэння паўстання, сярод якіх, згодна з аўтарскім меркаваннем, вылучаюцца саслоўная абмежаванасць выступлення, якое насіла пераважна шляхецкі характар і не стала масавым, народным (удзел сялян быў нязначным). Трапнае аўтарскае параўнанне "garstka nie zastąpi całego ludu" дакладна ілюструе дадзеную фатальную асаблівасць узброенага супраціўлення [3, 208]. Акрамя гэтага, немалаважным з'явіўся факт недаацэненасці ролі яўрэйскага насельніцтва як дадатковай сілы (у творы ёсць эпізод адмовы паўстанцамі яўрэйскай моладзі, якая мела намер далучыцца да паўстання), нерашучасць кіраўніцтва, спадзяванне на дапамогу іншых краін Еўропы – Францыі, Англіі, Аўстрыі.

"Cała nasza nadzieja obecnie w zagranicy spoczywa; jeśli obce mocarstwa dadzą nam pomoc, może rzeczy wezmą jeszcze dobry obrót", – так разважаў пра лёс паўстання адзін з галоўных герояў рамана Юліўш Каньскі [3, с.241]. Як вынікае з тэксту твора, у Францыю з дыпламатычнай місіяй накіраваўся генерал польскай арміі Карл-Ота Княжэвіч (застанецца ў эміграцыі). Аднак, польскае пытанне не атрымае ў французаў хуткага вырашэння пасля таго, як на аўстрыйскай тэрыторыі войску генерала Юзафа Дзвярніцкага пад прымусам тамашняй улады давядзецца скласці зброю. Аўстрыя, нягледзячы на чаканні палякаў, не падтрымала польскі нацыянальны рух 1830-х гг., як гэта было падчас Барскай канфедэрацыі (1768 – 1776).

Пасля ўзяцця Варшавы расійскім войскам лёс паўстання быў канчаткова вырашаны. Ваенны ўрач, удзельнік паўстання Юліўш Каньскі разам з жонкай адправіцца ў палітычную эміграцыю. У Францыі знойдуць прытулак "gwiazdy Polski" паэты-рамантыкі А. Міцкевіч, Ю. Славацкі і многія іншыя. Як вядома, менавіта пятая эміграцыйная хваля (1831 г.) стала самай масавай, у выніку якой дзясяткі тысяч чалавек знайшлі другую радзіму ў Францыі, Англіі, Бельгіі, Злучаных Штатах Амерыкі. Палітычная эміграцыя стала адзінай магчымасцю пазбегнуць пакарання з боку расійскай улады. У гэтай сувязі паказальны дыялог Ванды Каньскай (з дому Жарніцкіх) з бацькам Юліўша, у якім на пытанне пра неабходнасць такіх рашучых мер як эміграцыя пані Каньска адкажа: "Albożby car pozwolił im pracować? skrępowałby ich myśli, okuł serca, orłów w biedne ptaszyny pozamieniałby! Tam swobodnie pracować mogą i stamtąd budzić będą nasze serca, krzepić naszą nadzieję" [3, с.290].

Становішчу палякаў за мяжой прысвечаны эпілог рамана, які пачынаецца з апісання жыцця сям'і Каньскіх у Парыжы. Доктар мае абшырную практыку, яго падтрымлівае ў любых нягодах каханая жонка. Адным з цэнтральных эпізодаў заключнай часткі твора стала апісанне нядзельнай вячэры ў доме Каньскіх, на якую быў запрошаны А.Міцкевіч. Пані Ванда імкнецца парадаваць знакамітага госця стравамі літвінскай кухні, за сталом збіраюцца прадстаўнікі польскага эміграцыйнага руху. Іх намаганнямі ў Францыі створаны камітэт польскай эміграцыі пад кіраўніцтвам выбітнага дзяржаўнага дзеяча, пісьменніка Банавентуры Немаеўскага. Аднак, сярод удзельнікаў камітэта ўзніклі непаразуменні, што не дазваляе арганізацыі стаць кансалідуючым цэнтрам эміграцыі. Юліўш Каньскі з жалем гаворыць пра пастаянныя спрэчкі суайчыннікаў, што не дазваляе палякам за мяжой рэалізаваць асветніцкія ідэі (напрыклад, адкрыць польскую школу ў Францыі), стварыць прытулак для землякоў-эмігрантаў, якія не маюць матэрыяльных сродкаў і магчымасці працаваць. Разам з тым, не ўсе палякі-эмігранты разлічваюць на дапамогу французаў: "Francya przygarnęła nas życzliwie i nie odmawia wsparcia tym, którzy przedstawią dowody ubóstwa, lecz nie każdy rękę wyciągać potrafi, by u obcych żebrać jałmużny" [3, 298]. Узорам высокага пачуцця годнасці і нацыянальнага гонару стаў вобраз Адама Сакалоўскага, які ў крытычнай сітуацыі адсутнасці працы гатовы хутчэй памерці, абы толькі не жыць з чужой ласкі.

Сімвалічна завершыцца фінальная размова ўдзельнікаў вячэры словамі А. Міцкевіча: "… my, wieszcze narodu, nie dozwolimy umrzeć Polsce, stąd będziemy krzepić braci, którym niewola ducha osłabi, to cel naszej pracy" [3, с.305]. Лідар польскай эміграцыі верыць, што, нарэшце, "слова ператворыцца ў справу".

У эпілогу аўтарка падкрэсліла, што падтрымкай палякам-эмігрантам сталі верныя ім жанчыны, якія цярпліва падзялілі з суайчыннікамі нялёгкае жыццё ў выгнанні. У рамане згадана імя Клаўдзіі Патоцкай (Klaudya Potocka) як адной з полек, атрымаўшых удзячнасць ад паўстанцаў за сваю дабрачыннасць. Клаўдзіна Патоцка (1802 – 1836) стала ўзорам дабрыні і самаахвярнасці: у Варшаве яна была сястрой міласэрднасці ў шпіталі падчас эпідэміі халеры, пазней, у эміграцыі, стала сябрам А. Міцкевіча і А. Адынца, апошні назваў яе «зоркай чысціні», прыкладам самаахвярнага служэння людзям [2, с.218].

Не ўсе ўдзельнікі ўзброенага выступлення змаглі пакінуць радзіму по сваёй волі. Лёс паўстанцаў, якіх асудзілі да выгнання ў Сібір, быў значна горшы. Эмацыянальна напружаны фінал рамана прысвечаны апісанню шляху польскіх патрыётаў-катаржан, якіх вядуць канваіры па этапу

Репозиторий БГУ

да месца прызначэння. Мастацкай удачай пісьменніцы стаў малюнак заснежанай, сцюдзёнай Расіі, яе прастораў, дзе ланцуг закаваных стомленых людзей, нарэшце, дасягнуў межавага слупа, аддзяляючага Еўропу і Азію, Табольскую і Пермскую губерніі, своеасаблівага сімвала, які таксама падзяліў лёс асуджаных герояў на дзве часткі – волю і рабства. Звон кайданоў суправаджае песню нявольнікаў, якая яднае людзей, дапамагае трымацца з апошніх сіл, захоўвае агонь незалежнасці ў сэрцах: "… Wszystko dobże będzie / I na polskim kiedyś trone / Prawy król zasiędzie" [3, с.306].

Подзвіг польскіх жанчын, якія дабраахвотна паехалі за сваімі блізкімі, не саступае па самаахвярнасці подзвігу жонак рускіх дзекабрыстаў. Невядомасць не застрашыла маладую пані Леонку Жарніцку, якая не пакінула роднага брата Тамаша аднаго: у кібітцы разам з іншымі кабетамі яна накіроўваецца ўслед за ім і падзяляе з родным чалавекам усе нягоды. Раман заканчваюць словы Тамаша, у якіх гучыць надзея, што калі-небудзь палякі вернуцца на радзіму і раскажуць маладому пакаленню пра падзеі, сведкамі і ўдзельнікамі якіх ім давялося быць.

Пісьменніца не абыходзіць увагай і тых палякаў, якія прынялі рашэнне застацца на радзіме пад уладай Расійскай імперыі. Яны вяртаюцца да вытокаў, у спадчынныя маёнткі, мацней прывязваюцца да зямлі, займаюцца земляробствам, што, відавочна, дазваляе героям захаваць псіхалагічны супакой у палітычна неспрыяльны час. Беларускі гісторык В. Швед адзначаў, што паражэнне Лістападаўскага паўстання мела значны ўплыў на маральны стан і палітычнае жыццё грамадства. Даследчык прыводзіць вытрымку з успамінаў вядомага мемуарыста з Навагрудчыны Э. Паўлоўскага: "Менавіта ў гэтым мэта захопніцкіх урадаў, тут ахілесава пята заваёванага народа! Грамадскасць, маральна і матэрыяльна знясіленая, пазбаўлена энергіі, не спасобна да ініцыятывы, перастае быць бяспечнай" [1, с.325].

Як вынікае з аналізу твора, Т.Я. Папі стварыла раман з улікам традыцый рамантызму (што ўвогуле было характэрна для польскай гістарычнай прозы гэтага перыяду), таму галоўны лейтматыў твора – служэнне на карысць Айчыне, выхаванне маладога пакалення на аснове ідэалаў продкаў, фарміраванне выразна акрэсленай грамадзянскай пазіцыі юнакоў і дзяўчат. Значную ўвагу ў рамане пісьменніца надала падзеям пасля паражэння паўстання, вылучыўшы тры тэндэнцыі тагачаснай рэчаіснасці: умоўнае прыняцце неспрыяльных абставін і жыццё пад расійскай уладай; дабравольную палітычную эміграцыю; прымусовае зняволенне захопленых у палон паўстанцаў, іх пажыццёвую высылку ў Сібір.

Спыняючыся на лёсе эмігрантаў, аўтарка вызначыла галоўныя праблемы руху і напрамкі дзейнасці эміграцыйнага кола ў Францыі па падтрыманні суайчыннікаў за мяжой і сувязях з тымі, хто застаўся на радзіме. Адлюстраванне лёсу палякаў, асуджаных да катаржных работ, пададзена пісьменніцай з акцэнтам на двух момантах: жорсткасці пераможцаў і нескаронасці пацярпелых. На думку пісьменніцы, пачуццё патрыятызму і імкненне да свабоды – базісныя рысы польскай нацыі, якія маюць пазачасавае кансалідуючае значэнне і дазваляюць палякам не губляць надзею на вызваленне.

Можна сцвердзіць, што раман Т.Я. Папі «Цярністым шляхам» стаў мастацкім дакументам эпохі, а таксама сведчаннем падтрымкі французскімі ўладамі патрыятычнага польскага руху ў перыяд палітычнай экспансіі Расійскай імперыі. Думаецца, што для маладых чытачоў канца XIX стагоддзя раман стаў своеасаблівым падручнікам, які не толькі дэманстраваў узор мужнасці, прыводзіў да думкі пра непарыўнасць сувязі пакалення паўстанцаў і тых, хто прыйшоў ім на змену, але таксама служыў своеасаблівай падтрымкай польскай моладзі ў неспрыяльнай палітычнай сітуацыі.

Літаратура

1. Швед, В.В. Паміж Польшчай і Расіяй: грамадска-палітычнае жыццё на землях Беларусі (1772-1863 гг.) / В.В.Швед. – Гродна: ГрДУ, 2001. – 416 с.
2. Album biograficzne zasłużonych Polaków i Polek wieku XIX / z przedm. St. Krzemińskiego. – Warszawa, 1901 – 496 s.
3. Gałęzowska, J.T. Po ciernistej drodze: powieść historyczna z dziejów powstania 1830 roku dla młodzieży / J.T. Gałęzowska. – Kraków: Drukarnia Narodowa F.K.Pobudkiewicza, 1896. – 312 s.
4. Markiewicz, H. Pozytywizm / H.Markiewicz. – Warszawa : Wydawnictwo naukowe PWN, 2002. – 610 s.

A.A.Gladkova
Vitebsk State University named after P.M.Masherov
e-mail: anngrin@mail.ru

Understanding the fate of the uprising of 1830-1831 in the novel T.Ya. Papi "On the Thorny road"

Key words: the emigration movement, the uprising of 1830-1831, the Polish-Lithuanian Commonwealth, Russian empire, confederation.

The article discusses the fate of the rebels of 1830-1831, reflected in the novel by Polish writer of the XIX century T. Ya Papi. Emphasized a special role of the emigration movement in France, where he was part of the uprising, also draws attention to the position of the poles deported into the Russian Empire.

Репозиторий ВГУ